БЕЛАРУСКАЯ МОЛАДЗЬ

Выдае: Згуртаваньне Беларускае Моладзі ў Амэрыцы

13

BYELORUSSIAN YOUTH

Published by Byelorussian Youth Association of America

1962

ЗЬМЕСТ

НАШЫЯ ПРАДСТАЎНІЦТВЫ

ЗША
Miss L. Michalcyk, 1211 Starkweather Ave., Cleveland, Ohio
Mr. M. Kuczura, 1217 N. Wolcott Ave., Chicago 22, Illinois
Miss S. Pleskacz, 17574 Brush Ave, Detroit 3, Mich.
Mr. M. Sienka, 24 Herman St., South River, N. J.

Канада
Mr. U. Baranovich, 111 Lindsey Ave., Toronto, Ontario
Mr. J. Babrouski, 1008 Dovercourt Rd, Toronto, Ontario, Canada.
Miss M. Ignatau, 7808 Birnam St., Montreal, Quebec.

Ангельшчына
Mr. A. Laszuk, 97 Moore Park Road, London S. W. 6

Бэльгія
Mr. M. Streczyn, Place Hoover 19, Louvain

Аўстралія
Mr. W. Akavity, 80 Tapleys Hill Rd., Royal Park, S. A.
Mr. M. Nikan, 14 Steel St., Spotswood, Victoria
Mr. A. Vasilenia, 39 Edwin St., Croydon, New South Wales.

Адрыс рэдакцыі: „Беларуская Моладзь", 401 Atlantic Ave., Brooklyn 17, N. Y.

Гадавая падпіска у ЗША й Канадзе — $2. Грашовыя пераказы выстаўляць на: "BYELORUSSIAN YOUTH"

Text in English and Byelorussian. Four times a year. Supplements issued irregularly.
Byelorussian Youth Association of America, 401 Atlantic Ave., Brooklyn 17, N. Y.

БЕЛАРУСКАЯ МОЛАДЗЬ

Квартальны часапіс беларускага маладога пакаленьня ў Амэрыцы
Выдае: Згуртаваньне Беларускае Моладзі ў Амэрыцы
Рэдагуе: Калегія

Год выд. IV. СТУДЗЕНЬ—САКАВІК 1962 г. **№ 13**

Вітаем Усіх Беларусаў із Сьвятам 25-га Сакавіка!



Byelorussia was proclaimed independent in this theater in Miensk.

25th of March — Byelorussian Independence Day

44 years ago, on March 25, 1918, after 123 years of Russian occupation *. Byelorussia BECAME AGAIN AN INDEPENDENT COUNTRY.

The delegates to the All-Byelorussian Congress, convening in Miensk, proclaimed Byelorussia an independent DEMOCRATIC REPUBLIC (Biełaruskaja Narodnaja Respublika" — B. N. R.).

The Council of the All-Byelorussian Congress issued a Constitutional Act, which spelled out the POLITICAL ORDER AND PRINCIPLES of the BNR:

* Until 1795, Byelorussia was independent and known as the Grand Duchy of Lithuania. Byelorussian language, culture and traditions prevailed in this state. Refer to the "B. Y." supplement: "LITHUANIA — Litva, the historical name of Byelorussia".

— its territory, which includes all areas, where Byelorussian population constitutes majority.
— formation of the Byelorussian Legislative Assembly on basis of a general direct, secret and proportional election law, applicable to all citizens regardless of origin or religion.
— freedom of speech, press, meetings, strikes and associations; inviolability of person and property.
— full national and cultural autonomy for all peoples of the Republic.
— transfer of the land without ransom to those, who till it.
— public ownership of woods, lakes and natural resources.
— an eight-hour working day.

The independence of the BNR was recognized *de jure* by the Ukraine, Czechoslovakia, Austria, Finland, Poland, Turkey, Lithuania, Latvia, Estonia, Armenia and Georgia. It was recognized *de facto* by most other countries of the world.

However, the newly regained freedom was soon crushed by the invading Russian Red Army. The government of the BNR was forced into exile; against the will of its people Byelorussia was made a part of the new Soviet Russian empire.

Today the Byelorussian Independence Day — March 25th, 1918 is commemorated by all Byelorussians, wherever they may be: by the emigrants in the free world, as well as by the members of the Byelorussian underground.

For us March 25th symbolizes the existence of the BNR, of an independent Byelorussian state not in the distant past, but recently — in the 20th century. THE FINAL RESULT OF THE EFFORTS OF ALL BYELORUSSIAN PATRIOTS CAN BE NOTHING LESS THAN THE RE-ESTABLISHMENT OF THE B. N. R.

Падзяка Адміністрацыі „БМ"

Адміністрацыя „Беларускае Моладзі" выказвае шчырую ўдзячнасьць усім чытачом „БМ", якія аднаўленьнем падпіскі на 1962 год ды ахвярамі запраўды падтрымалі нашае выдавецтва як матар'яльна, так і маральна.

НОВЫЯ ЖАЎНЕРЫ

У вапошнім часе колькі нашых сяброў уступіла ў вайсковыя рады: **Багуслаў Станкевіч** ды **Аркадзь Каваль** у армію, а **Расьціслаў Данілюк** — у морскую пяхоту.

11-га сакавіка беларуская грамада **Нью-Ёрку** наладзіла ўрачыстае разьвітаньне з **А. Кавалём** і **Р. Данілюком**. Прадстаўнікі нашага грамадзтва (сп. М. Тулейка, У. Курыла ды Уладыка Васілі) пажадалі хлапцом правесьці вайсковую службу карысна й заклікалі іх застацца ўсюды шчырымі Беларусамі.

Сябра Б. Станкевіч, які пайшоў у войска раней, ужо прайшоў асноўны трэнінг і пачаў курс дызэльных матораў у вадмысловай школе.

BYELORUSSIA BETWEEN TWO WORLD WARS

(Continued from No. 12)

The treaty of Riga, signed in 1921, divided Byelorussia between Poland and the Soviet Union. The Soviet Byelorussian Republic (BSSR) was established in the central part of the country with the capital in *Miensk*. The Communist regime in the BSSR supported a limited national and cultural autonomy, hoping that this policy would eventually win Byelorussian farmers and workers for Communism. Many Byelorussian patriots took advantage of this new opportunity to develop Byelorussian culture and economy; their aim was not to strengthen the Soviet state, but to make their country ready for eventual freedom and independence.

Crushing of Byelorussian patriots in the BSSR.

The patriotism of the Byelorussian cultural workers, scholars and students in the BSSR, and the results of their efforts soon became a real thorn in the side of the Russian Communist authorities. Along with increased cultural autonomy came also demands for greater political autonomy for Byelorussians; possibility of receding from the Soviet Union was seriously considered.

M. Azbukin
noted Byelorussian economist (shown in exile — in the Ural mountains).

To prevent the realization of such plans in the 1930's the Communist party gave the signal for an all-out assault on "Byelorussian nationalists". The more independent and patriotic among the writers were first to be attacked by the Communist press. Such attacks normally preceded arrest and deportation. Then the popular media of entertainment, such as theater and movies were forced to withdraw Byelorussian plays and films and replace them more and more with Russian-language imports. A very systematic campaign was initiated in order to destroy the Byelorussian culture and to stifle the emerging native talnet.

The community of Byelorussian writers and poets did not remain silent. Both non-Communists, as Jazep Pušča and U. Duboŭka, as well as those, who were in favor of a Byelorussian form of Communism (Zarecki, Dudar, Aleksandrovič), used all their wit and eloquence to argue the case for Byelorussian people's culture and language, free of foreign persecution. This persecution was especially bitter and disappointing to the so-called "National Com-

munists", who hoped to insure Byelorussian cultural life by their support of the Moscow regime.

These "leaders" of the BSSR were also hit by a purge. The Commisars of Education and Agriculture, Balicki and Pryščepaŭ were dismissed and later arrested. The same fate met the premier of the BSSR, J. Adamovič (already in 1927), and also the creator of the BSSR — the loyal Communist Žmitro Žyłunovič, who later lost his mind in a Soviet prison. Few years later, practically all leading Byelorussian Communists were charged with allowing the party to be infiltrated by nationalists. Dismissals, deportations and imprisonment were the usual result of such accusations. Pryščepaŭ's agrarian reform, suited to the local Byelorussian conditions, was destroyed. In all government institutions Byelorussians were gradually replaced by reliable Russians, sent in from the East.

Thus already 30 years ago Byelorussians have learned that the Soviet Union is not primarily interested in promoting Communism as ideology; it must be Communism in its Russian form. This lesson was confirmed again recently, when the Hungarian national Communists were brutally crushed in 1956, attempting to regain independence of their country from Moscow.

At the same time the Soviets concentrated on forcing the Byelorussian farmers to join the farm collectives. This new form of serfdom was foreign and especially repulsive to the Byelorussian farmer, who before the coming of Communists had dreamed so long of freedom and his own piece of land. However, his stubborn resistance was broken by the naked show of Soviet force; over 1 million Byelorussian farmers were deported to Siberia and Central Asia.

In the early 1930's over 300 persons - journalists, writers, administrators, politicians, teachers — the leaders of the Byelorussian cultural and civic life were imprisoned or banned from their country. They were accused of being "Byelorussian National Democrats" and of belonging to the allegedly illegal "Union for Liberation of Byelorussia". According to the accusers, the aim of this organization was to establish an independent Byelorussian state by seceding from the Soviet Union. Ironically, only recently — in 1960, the Soviet premier Khrushchev in his speech in the United Nations made a special point of the fact, that the Soviet constitution guarantees each constituent Soviet republic the right of secession. It is even sadder to note, that few of his listeners tried to expose this outright lie. The representatives of the new African and Asian states, which seceded from old colonial empires peacefully and without a costly struggle for freedom, remained silent.

Even though no evidence was produced to support the charges against the arrested intellectuals and civic leaders, they were de-

(Continued on p. 8)

СТАРЭЙШЫЯ МАЛОДШЫМ **Ант. Адамовіч**

ЛІРНІК КРАІНЫ ВЕТЛАЙ

(З успамінаў пра Міколу Равенскага)

У Маскве Равенскі пражыў каля сямёх год, здабываючы закончаную музычную асьвету ў музычным тэхнікуме пры кансэрваторыі (да 1927 г.) і на кампазытарскім аддзеле самой кансэрваторыі (па 1930 год; датуль музычная асьвета ягоная абмежвалася рэгэнцкімі курсамі, пройдзенымі ў 1913-15 г.г. у Маскве й Пецярбургу). Гады гэтыя былі якраз найбольш дабрабытнымі й свабоднымі ў цэлай савецкай гісторыі, пазначанымі г. зв. НЭП'ам — уведзенай Ленінам „новай эканамічнай палітыкай", якая хоць і пачала ліквідавацца Сталінам ад 1928 г., але да 1930 г. ліквідацыя гэтая абывалася яшчэ бяз мэтадаў масавага паліцыйнага тэрору й рэпрэсіяў. Пасьля Равенскі любіў успамінаць тыя гады як ледзь не „залатую пару" свайго жыцьця й творства.

У Маскве тады была ладная беларуская культурная калёнія, пераважна з студэнтаў, якія мелі свой беларускі студэнцкі клюб, што ў васобе Равенскага дастаў свайго дабрахвотнага й сталага хормайстра для зьменных складам, але пэрманэнтных студэнцкіх харавых гурткоў. Аднак, хармайстарская дзейнасьць Равенскага гэтаю парою адыходзіць на задні плян перад працаю кампазытара, усё большыя асновы й стымулы да якое дае яму здабываньне музычнае асьветы. Яшчэ больш аднак стымулюе гэтую працу знаёмства й блізкое пасяброўваньне з паэтам - узвышэнцам Уладзімерам Дубоўкам, сям'я якога апынілася ў Маскве яшчэ ў выніку „бежанства" часоў I сусьветнае вайны.

Вялізарны ідэйны, інтэлектуальны й творчы ўплыў Дубоўкі бясспрэчны й вызначальны ня толькі для гэтых маскоўскіх год, але й для ўсяго канчальнага сфармаваньня і нацыянальна-ідэйнае й творчае постаці Міколы Равенскага, што заўсёды пасьля ахвоча й удзячна прызнавалася ім самым. Уплыў гэты сьведама кіраваўся ў бок выразленьня з Равенскага музыкі-кампазытара, піянера таго беларускага „узвышша, якое пабачаць вякі й народы" ў музыцы, ініцыятарам і карыфэем якога ў літаратуры быў Дубоўка. Як такога, першага й адзінага тады патэнцыяльнага „узвышэнца ў музыцы", заўсёды пратэгаваў Равенскага Дубоўка. Дарэчы, Дубоўку належыць і адзіны дасюль нарыс пра Равенскага — „Беларускі кампазытар Мікола Равенскі" — надрукаваны ў часапісе „Узвышша", № 3 (9) за 1928 г. (хто цікавіцца — можа знайсьці ў славянскім аддзеле публічнае бібліятэкі Нью-Ёрку).

У першых маскоўскіх гадох Равенскі-кампазытар асабліва захапляецца багатай і складанай музычнай формай „фугі" — да 1928 г. ён стварае цэлых 14 сваіх фугаў. Гэтае захапленьне фугаю Дубоўка ў сваім кагадзе ўспомненым нарысе асьвятляе ў пляне блізіні гэтае формы да беларускае нацыянальнае, народнае музыкі, асабліва купальскіх і вясельных песьняў, паклікаючыся, як на адзін з прыкладаў, на вельмі папулярную тымі гадамі й запраўды адну з найхарашэйшых нашых песьняў — купальскую „Ой, рана на Івана". Сярод гэтых фугаў Равенскага першае месца займаюць напісаныя на словы Уладзімера Дубоўкі — найперш, „О,

Беларусь, мая шыпшына" (чатырохгалосная фуга для мяшанага хору). Апрача фугі, вялікую даніну аддае кампазытар і іншым музычным формам, як сюіта, ноктурны, прэлюды, канцэртныя мазуркі й да г. п. Іноўжа, на словы Дубоўкі — „Такая ноч" — ствараецца ім адна з найлепшых ягоных рэчаў наагул ды найбольш улюбёная й самым ім і публікай, найпаўнейшае й найудалейшае выражэньне ўсіх лепшых якасьцяў гэтага нашага кампазытара, ягонае тае ветласьці, мяккасьці, праніклівасьці, задушэўнасьці (яе Равенскі аднавіў і любіў выконваць і на эміграцыі, асабіста вядучы партыю йскрыпкі).

Цікава, што ў гэтую пару Равенскі ўпяршыню зварачаецца й да паэзіі Янкі Купалы. У „Зборніку песьняў з нотамі" 1922 г. маем аж 4 кампазыцыі Равенскага на словы Якуба Коласа — больш нат, як на словы выяўна ўлюбёнае Канстанцыі Буйлы („Край наш бедны", „Вясна", „Зіма", „Ой ты, вецер неспакойны"), тымчасам як на словы Янкі Купалы аніводнае (толькі Купалавы словы заміж арыгінальных узятыя да гарманізацыі народнае песьні „Гэй, паехаў сын Даніла"). Цяпер-жа Равенскі кладзе на музыку найперш Купалаў — і, сказаць-бы, адзін з найбольш купалаўскіх — верш „У вырай" („Гэй, вольныя птахі"). Рука Дубоўкі як найлепш вычуваецца ў выбары якраз гэтага вершу зь ягонымі заклікамі да „патомкаў Крывічоў"— зьведаваць сьветы арлінным узмахам", „выляцець к славе з пагібельнай плесьні і песьняў агністай дзівіці народы"— клічамі „да неба"— да таго-ж „узвышша" ў выяўным прадухапленьні гэтае ідэі Дубоўкі й цэлага ўзвышэнскага руху.

Гэтаю-ж парою, ня толькі пад уплывам, але й пры вызначальнай кіраўнічай дапамозе Дубоўкі Равенскі зварачаецца й да музычнае крытыкі. У 1928 г. у часапісе „Узвышша" зьяўляюцца два ягоныя грунтоўныя крытычныя артыкулы — „Гарманізаваньне беларускае народнае песьні маскоўскімі кампазытарамі" (№ 4 (10), пад артыкулам дата 7 ліпеня 1928 г.) ды „Пра зборнік песьняў, які выдрукаваны на Беларусі для дзяцей дашкольнага ўзросту" (№ 6(12), дата 15 верасьня 1928 г., абодвы артыкулы можна бачыць у тым-жа славянскім аддзеле публічнае бібліятэкі Нью-Ёрк). Артыкулы былі апрацаваныя й нат перапісаныя самым Дубоўкам (рукапісы праходзілі й праз мае рукі пры трыманьні карэкты часапісу „Узвышша"). Кажны, хто бліжэй знаў Равенскага, ведае, як лёгка мог ён разьвіваць свае ідэі ў жывой асабістай гутарцы і як блізу беспарадным аказваўся пры выкладаньні думак на пісьме, так што напісанае ім заўсёды трэ было некаму апрацоўваць. У вабодвых артыкулах — строга ўзвышэнскае гледзішча вымаганьня высокае й нацыянальнае мастацкае культуры й асуджаньня ўсякае „халтуры" й чужэнскага ганоданьня.

Улетку 1927 г. студэнты тагачаснага 3-га курсу менскага Беларускага Пэдагагічнага Тэхнікуму ймя Усевалода Ігнатоўскага мелі паводля навучальнага пляну экскурсію ў Маскву. Да студэнтаў гэтых належалі, апрача мяне, тры маладыя ўзвышэнскія паэты — Пятро Глебка, Максім Лужанін і Сяргей Дарожны (апошні ужо нябожчык — загінуў на сталінскай катарзе, а мо йшчэ ў турме ў 1938 г.). Зразумела, што мы пастараліся ўрваць часу ад агульнае экскурсіі для свае прыватнае — наведзінаў нашага

(Працяг на бач. 13)

БЕЛАРУСКІЯ СПАРТАВІКІ У 1961 г.

Мінулы год прынёс беларускаму спорту дзесяткі перамогаў на міжнароднай арэне ды адкрыў шмат новых талентаў сярод моладзі.



Выезд сяброў ЗБМА на ірты (лыжы)

Вельмі добра паказаліся **фэхтавальнікі:** алімпійскі чэмпіён **Віктар Ждановіч** ды мянчане **Арнольд Чарнушэвіч** і **Дыяна Ясюкевіч,** якія здабылі залатыя мэдалі на пяршынсьцьве сьвету ў Італіі.

У дужаньні вольным стылем **Уладзімер Лятун** і **Аляксандра Мядзьведзь** здабылі годнасьць чэмпіёнаў СССР. У выніку міжнародных змаганьняў у Японіі ведамы дужаньнік клясычнага стылю, **Алег Караваеў,** і надалей застаўся чэмпіёнам сьвету ў лёгкай вазе.

Дазнаныя вэтэраны алімпіяды, **веславаньнікі Сяргей Макаранка** зь Берасьця й **Леанід Гейштар** з Гомелю й сёлета былі першыя ў Эўропе на дыстанцыі 10,000 м. **Адварды Яраш** стаўся чэмпіёнам Эўропы ў **страляньні** з малакалібровае стрэльбы. **Вера Зубава** здабыла абсалютнае пяршынство СССР у скоках з **парашутам** для жанчынаў.

Беларускія **гімнастыя** таксама дасягнулі міжнароднага ўзроўню: асабліва алімпіёнік **Мікалай Мілігула** ды **Алена Ваўчэцкая,** якая здабыла першае месца ў СССР у вапорных скоках.

У лёгкай атлетыцы ня відаць новых прозьвішчаў. Алімпійскі чэмпіён **Васіл Рудзянкоў** застаўся найлепшым у сьвеце ў кіданьні молатам з вынікам 68.92 м. У кіданьні молатам ужо больш за 4 гады йдзе заўзятае змаганьне між Беларусамі — Міхасём Крываносам ды ягоным вучнем, Рудзянковам з аднаго боку — і Амэрыканцам Гарольдам Каналі з другога боку. Каналі трымае сусьветны рэкорд — 70.10 м.

Вэтэранка кароткіх бегаў, мянчанка **Марыя Іткіна** ўстанавіла новы рэкорд СССР у бегу на 200 м. — 23.4 сэк. На гэтай-жа дыстанцыі яна перамагла ведамую Амэрыканку„ „лётаючую газэлю", Вільму Рудольф.

У беганьні на **коўзіках** (каньках) **Адварда Матусэвіча** можна ўжо залічыць да сусьветнае эліты. У сьнежні 1961 г. ён падзяліў першае **месца** ў бегу на 1500 м. з чэмпіёнам сьвету, Барысам Сьценінам.

У міжнародных змаганьнях беларускія **дужаньнікі** перамаглі Фінляндыю й Югаславію, **цяжкія атлеты** (штангістыя) — Польшчу й Усходнюю Нямеччыну, **гімнастыя** — Польшчу й **баксэры** — Мадзяршчыну.

BETWEEN TWO WORLD WARS . . .

ported to various Siberian concentration camps, where most of them perished *. Their works were banned, and in many cases destroyed. The Byelorussian people were left leaderless and at the mercy of the Russian Communist colonizers.

Thus came to an end the brief period of cultural freedom in the BSSR. The democratic and dynamic culture of the Byelorussian people, which mirrored the long struggle for national and social liberation, was deliberately destroyed by those, who today claim to be the "champions of colonial peoples". Pretending a fight against the "Byelorussian National Democratic" ideology, the Russian Communists actually declared a war on the entire Byelorussian people, regardless of their ideology — democratic or communist, and regardless of their background — peasant or intellectual.

In the middle of 1930's the air of oppression hung heavy in the BSSR. It made Marshal Pilsudski's "less efficient" dictatorship methods in Western Byelorussia seem almost humane. Russian bureaucrats and "experts" were imported to run the country. The Russian language became dominant in public institutions, press and theater. Russian returns also to the universities and even to many high schools as the only language of instruction. Byelorussian language is gradually confined to public school, some of the press and propaganda literature.

In 1933 an official "reform" of the Byelorussian literary language (of its orthography and gramar) was carried through — an ill-disguised attempt to make it more similar to Russian. The Czarist generals and other heroes of Russian history are now publicly glorified, while any attempt to study objectively the Byelorussian history and tradition is branded as a "nationalist deviation" and anti-Soviet activity.

The everyday life became pervaded with numbing fear and distrust of one's neighbors, often driven by official terror to inform on their friends. The workers were subject to the inhuman "Stakhanovite" ** system of exploitation. The uprooted farmer was forced to work as a hired hand for a ridiculously low payment in kind (not in money) on the land which rightfully belonged to him. The constant worry how to survive and speculation needed to keep one's head above the water, occupied the thoughts and energies of the

* Read the article "Apošnija dni Uładzimiera Zyłki" (Last days of U. Zyłka) in this issue of "BY".

** First a "Stakhanovite", working under more favorable conditions that his co-workers, exceeds his designated "work norm". Then his accomplishment becomes the regullar work norm for other workers, who, of course "voluntarily" pledge to fulfill it without an increase in pay.

terrorized Byelorussian people and reduced their longing for freedom to mere dreams and hopes. This was the situation in the BSSR on the eve of the World War II.

Lićvin.

SUDDENLY, as if nothing happened, the Soviet Byelorussian newspaper "Litaratura i Mastactva" printed several poems by *Uładzimier Zyłka*, a member of the "Uzvyšša" literary society, who was imprisoned in 1930 as a "National Democrat" and exiled to the Ural mountains. There he died of tuberculosis on March 1, 1933.

Instead of publishing Zyłka's poetry, the Soviet government should have mentioned, how it persecuted the poet until his very death. Fortunately, Zyłka's friends, who were exiled with him, can tell about the tragic end of this young and talented poet.

АПОШНІЯ ДНІ УЛАДЗІМЕРА ЖЫЛКІ

На ўсё жыцьцё запамяталіся нам тыя чэрвенска- ліпнёвыя дні 1930 году ў Менску. Чорныя вораны *, набітая да адказу турма, НКВД, допыты й пачатак этапаў. Празь нявыказаныя пакуты, праз турмы: Менскую, маскоўскія Батыркі, Валагодзкую й нарэшце Вяцкую нашая група нацдэмаў прыбыла у горад Кацельніч (Вяцкая, цяпер Кіраўская вобл.). Там мы спаткаліся з прыбылымі раней Кацярынічам і Савічам і тут-жа пазьней спаткаліся і з Жылкам. На рэгістрацыі ў камэндатуры Кацярыніч заўважыў Жылку, але да яго не падыйшоў, бо не хацеў перад энкавэдыстымі выяўляць сваё знаёмства. Каб ня згубіць сьледу Жылкі, мы выправілі Адама Міцкевіча на вывед, і праз гадзіну Жылка ўжо быў сярод нас. З выгляду Жылка быў вельмі худы, але стараўся трымацца бадзёра. У часе хады затыхаўся, але ўсё-ж не хацеў прысесьці адпачыць. Паэта хварэў на сухоты і быў пэўны, што саманамовай можна перамагчы хваробу.

Жылка расказаў нам, што быў арыштаваны разам з намі й пасаджаны ў Менскую турму. Але месяцаў за пяць ён гэтак аслаб, што турэмныя дактары азначылі, што паэта ня будзе жыць. Жылку адвезьлі дахаты, дзе ён пралежаў месяцы з чатыры й крыху папраўіўся, пачаў хадзіць. НКВД яго сачыла, і як ён толькі крыху ачуняў, яму абвесьцілі, што ён засуджаны на пяць год высылкі. Аднак з увагі на ягоны хворы стан, яму далі магчымасьць выбару — ехаць пад канвоем або без канвою. Жылка, зразумела, выбраў апошняе, і сам зьявіўся ў Кацельніч.

У Кацельнічы мы яшчэ пабылі пяць дзён. Да месца высылкі нам заставалася кілёмэтраў дзьвесьце пяцьдзесят у бок ад чыгункі. Нам былі дадзены выбар — ісьці пехатой пад канвоем да месца высылкі, або як-небудзь дабірацца самым. Мы наважылі ехаць без канвою, па рацэ Вятцы да прыстані Мядзьведак. Ад гэтае прыстані нам трэба было разьехацца ў розныя бакі, кажны да свайго месца, вызна-

* Чорны воран — аўтамабіль, у якім у Савецкім Саюзе возяць арыштаваных.

чанага НКВД: Я, Азбукін і Улашчык у г. Налінск, Жылка й Сасіновіч — у г. Уржум, Міцкевіч, Гурскі й Корань — у г. Малмыж.

На працягу пяцёх дзён мы шмат аб чым гаварылі. Жылка быў у Менску на акадэмічнай канфэрэнцыі ў 1927 г. Яго абкружалі ў часе канфэрэнцыі вылучна камуністыя і ўсё ўгаворвалі застацца — ня ехаць назад у Чэхію *. Аднойчы неяк Жылка сустрэўся з намі — беларускімі патрыётамі адзін на адзін і папытаўся ў нас, ці варта заставацца. Мы ўсе ў вадзін голас параілі яму ехаць назад і жыць у Чэхіі. У гутарцы я й прыпомніў Жылку нашыя парады. Пачуўшы гэта, Жылка ўстаў і сказаў: „— Ведаеш, браце, мае раны мне й так баляць — ты іх больш не цьвялі". Я папрасіў выбачэньня, ды больш аб гэтым ніхто нічога ня ўспамінаў.

Мы купілі дзьве лодкі — адну маленькую, а другую вялікую. У маленькую пасадзілі Жылку, каб яго ніхто не турбаваў і ён адчуваў сябе больш вольна. Маленькая лодка была прывязаная да вялікае й пасажыру гэтае лодкі ня трэба было веславаць.. За капітана нашае „эскадры" быў Міцкевіч, бо ён нарадзіўся й вырастаў на Нёмане. Зь нейкае пасьцілкі, ахвяраванае добрымі людзьмі, ён зрабіў ветразь і мы цэлы дзень ехалі не вяслуючы, але пад вечар наляцеў буй - вецер, парваў сьціплы ветразь і ледзь-ледзь нас не патапіў. Ехалі ўдзень, а ўначы раскладалі вогнішча й адпачывалі.

За тыдзень мы прыехалі на апошнюю прыстань Мядзьведкі, адкуль мы мусілі разыйсьціся на пяць гадоў у розныя бакі. Тут мы даведаліся, што ў тым горадзе, дзе будзе адбываць высылку Жылка, няма добрага доктара. Таму паэта папрасіў у тутэйшага НКВД дазволу паехаць з намі ў Налінск на тры дні на кансультацыю да доктара.

Тры дні быў з намі Уладзімер Жылка. На чацьверты дзень мы нанялі хурманку й паэта паехаў да месца свае высылкі ў г. Уржум. Першы час мы досыць акуратна ліставаліся. Жылка ніколі ні на што не наракаў. Неўзабаве мы даведаліся, што ён знайшоў працу ў тамтэйшай бібліятэцы.

Але за колькі месяцаў мы атрымалі ад Сасіновіча ліст, у якім ён пісаў, што Жылка адчувае сябе вельмі дрэнна. Мы, параіўшыся паміж сабою, пастанавілі прапанаваць паэту кінуць працу і атрымліваць ад нас, сваіх сународзічаў, пасяродкі на жыцьцё. Жылка вельмі пакрыўдзіўся. Ён напісаў нам ліст, у якім, дзякуючы за наш добры намер, заўважыў, што яму міласьціна не патрэбная, бо ён заробіць і сам сабе на хлеб.

У канцы лістапада 1932 году Уладзімер Жылка лёг у больніцу. І помню, што чацьвертага сакавіка 1933 году я атрымаў ад Сасіновіча ліст, у якім ён пісаў:

„Сябры, падаю вам сумную вестку — няма сярод нас Уладзімера Жылкі. Першага сакавіка а сёмай гадзіне ўвечары ён памёр. Пахаваў я яго на тутэйшых могілках трэйцяга сакавіка а пятай гадзіне ўвечары..." Далей мы даведаліся зь ліста, што калі Уладзімер Жылка ня мог падняцца з ложка, за тыдзень да ягонае сьмерці, да яго прыйшоў у больніцу энкавэдысты. Ён заявіў, што НКВД дазваляе Жылку зьмяніць месца высылкі й навет дазваляе выехаць на пайдня. У той-жа час выклікалі ў гарадзкі аддзел аховы здароўя Сасіновіча й сказалі, што калі толькі будуць патрэбныя грошы на пераезд Жылкі, дык гэтыя грошы асыгнуе гарадзкі аддзел. А ў паэты ў гэты час ужо пачалася агонія.

Гэтакі зьдзек над паміраючым у высылцы выдатным беларускім паэтам маглі ўжыць толькі зацятыя ворагі нашага народу — бальшавікі.

Тыдні за два пасьля сьмерці Уладзімера Жылкі я атрымаў ад Сасіновіча ліст, але ўжо ня поштай, а праз знаёмых людзей. Адчыніўшы ліст, я прачытаў:

„Тэстамэнт або духоўніца, адпісаная Уладзімерам з Адама і Тацьцяны сынам Жылкавым".

Я зрабіў усё ад мяне залежнае, каб старанна перахаваць гэты выдатны мастацкі твор, а пасьля сканчэньня свае высылкі пазнаёміў зь ім усю нашую грамадзкасьць.

Калі я ўспамінаю цяпер тыя апошнія дні, праведзеныя з Жылкам, на памяць усплываюць радкі з аднаго ягонага вершу, які ён прачытаў нам у дарозе ад Кацельнічу да Мядзьведкаў:

Але нам будуць усё-ж мілейшы
Часы, калі зь нізін балот,

---

* Жылка выэміграваў у Чэхію зь Вільні ў 1923 г. Ён студыяваў гісторыю й філялёгію ў Празе.

СПАЧУВАНЬНЕ

Рэдакцыйная Калегія „БМ" і Галоўнае Кіраўніцтва ЗБМА выказваюць глыбокае спачуваньне **сп-ні Пагуда** з прычыны перадчаснае сьмерці сына Хведара.

СЬВ. ПАМЯЦІ ХВЕДАР ПАГУДА, БЕЛАРУСКІ СПАРТАВІК



Сьв. Памяці Хведар Пагуда.

Хведзя — гэтак мы яго клікалі. Заўсёды заклапочаны, актыўны, некуды сьпяшаючыся, Пагуда быў нападзе актыву моладзі ў грамадзкай працы, а ў спартовым жыцьці ён нікому ня саступаў першага месца. У далёкім нямецкім Міхэльсдорфе, ды ў Кліўленьдзе — ён быў штурхачом беларускага спорту на эміграцыі. Дзе мог, усюды арганізаваў клюбы, уваходзіў у кантакт зь мясцовымі спартавікамі, пачынаў трэнінгі . . .

Ці адну перамогу здабылі беларускія спартавікі дзякуючы яму. Ці адзін рэкорд у беларускім спорце паставіў Хведар Пагуда. Першаклясны бягун, тэнісісты, іртавік-лыжнік, — ды галоўнае — фубалісты. Футбол быў у яго ўлюбёны від спорту. У ім ён быў беспараўнальны.

Але разам з гэтым Хведар Пагуда быў беларускім нацыянальным спартавіком. Ён разумеў, што праз спорт шмат дзе можна папулярызаваць **беларускае** імя. І там, дзе бываў Пагуда, беларускі сьцяг красаваўся.

Доля ня судзіла яму вярнуцца на Бацькаўшчыну. Цяжкая хвароба здолела яго і ў веку ўсяго 31 году ён памёр. Няхай будзе лёгкай Табе, Дарагі Сябру, амэрыканская зямля!

З надзеяй ў шчаснасьць дзён сьвятлейшых
Устане ўзбуджаны народ.

Ня відна йшчэ ў завірусе,
Куды ляжыць ягоны шлях
Але дух творчы Беларусі
Жыве й змагае долі жах.

. . . Бяжыць суровая Вятка. Чытае сваe вершы Уладзімер Жылка. Мы, сьцяўшы зубы, яшчэ мацней налягаем на вёслы, бо ў нас ня згасла вера ў тое, што нашая ідэя правільная. Мы цьвёрда пераканаһыя, што наш народ ськіне гвалтоўную маскоўскую ўладу й Беларусь зробіцца вольнаю й самастойнаю.

Я. Кіпель.

У в а г а !

„ТВОРЫ" Ул. Жылкі можна купіць у кіёску ЗБМА ў Нью-Ёрку.

КАЛЯДНІЯ СЬВЯТЫ У НЬЮ-ЁРКУ И БАТЛЕЙКА

Калядамі Беларуска-Амэрыканскае Т-ва ладзіла ялінку дзяцём ды пры гэтай нагодзе дало ім паказ батлейкі (лялькавага тэатру) пры ўдзеле вучняў беларускае школкі й хору моладзі.

Лялькавы тэатр прыйшоў да Эўропы з Усходу (з Эгіпту) праз Грэцыю, дзе паказвалі ў ім Іліяду й Одысэю, а пазьней празь Італію. Каб наблізіць навуку рэлігіі да жыцьця, мніхі рабілі хвігуры, якія дэклямавалі на рэлігійныя тэмы: пра стварэньне сьвету, Салямонаў Двор. З часам у рэлігійныя тэмы ўціскаліся сьвецкія, сатырычныя тэмы. Тады забаранілі паказваць тэатр у касьцеле, і лялькавы тэатр перанёсься на вуліцу.

Адным з тыпаў лялькавага тэатру ў Італіі была наймічка Пульчынэля, якая перайшла ў Францыю як Полішынэль, а ў Ангельшчыну як „Панч энд Джуды". У Нямеччыне падобны паяц зваўся Каспэрле. Мэтаю лялькавага тэатру было вучыць і забаўляць людзёў. Гэтак на працягу стагодзьдзяў захаваліся старадаўныя легенды. Лялькавы тэатр у Чэхіі ўзмацняў народную культуру, калі край быў пад акупацыяй Аўстрыі. Паказваліся чэскія п'есы ў роднай мове.

Пасьлей у Заходняй Эўропе пазналі, што лялькі вельмі добрыя для імітацыі й асьмяшэньня некаторых асобаў, і запраўдныя мастакі пачалі займацца лялькавым тэатрам. Францускі філязоф Вольтэр, прыкладам, меў свой тэатр, а пісьменьніца Жорж Занд і сын яе паказвалі лялькавы тэатр на працягу 30-х год. Кампазытар Язэп Гайдэн укладаў музыку для такога тэатру ў Аўстрыі.

Старадаўны беларускі звычай хадзіць на Каляды з батлейкамі прыйшоў да нас з Захаду. Слова „батлейка" паходзіць ад места Бэтлеем у Палестыне, у якім нарадзіўся Хрыстос. Хаджэньне з батлейкамі цягнецца ад першага дня Калядаў да Грамнічнай нядзелі (2-га лютага). Дзеля таго, што вечары ад Калядаў да Трох Каралёў уважаюць за сьвятыя, калі няможна працаваць, дык гэтымі вечарамі ходзяць з батлейкамі. Гэтым звычайна займаюцца рамесьнікі, асабліва шаўцы. Ходзіць іх звычайна пяцёх або шасьцёх, у тым ліку два або тры хлапцы. Гэтыя возяць саначкі з батлейкамі, падаюць лялькі ды наагул памагаюць старэйшым. Ёсьць сем'і, ў якіх гэтым займаюцца колькі дзесяткоў год; батлейкавыя песьні перадаюць з роду ў род і хаваюць іх ад іншай кампаніі батлейнікаў. Батлейкавыя паказы бываюць з музыкай: адна-дзьве йскрыпкі й бубен. Усе песьні батлейнікі пяюць адным голасам.

Зыбраўшы ўсе рэчы свайго лялькавага тэатру, гэткая кампанія выяжджае да места й станавіцца на ведамым, людным месцы (у Менску, бывала, на рагу Петрапаўлаўскай і Юраўскай вуліцаў). Паказы складаюцца звычайна з 13 нумароў з рэлігійнымі бытавымі сцэнамі. Батлейка, паказаная ў Нью-Ёрку, была ўзятая з этнаграфічных зборнікаў Шэйна й Раманава.

Дзеці вельмі цікавяцца лялькамі й ня могуць ад іх адарвацца. Калі было дазволена дзецям беларускае школкі самім пагуляць у лялькавы тэатр, зараз сцэна пажвавела. Тут дзьве лялькі біліся, там узноў іншыя дзьве абыймаліся, а адна жвава гестыкулявала, быццам пераконваючы публіку. За сцэнай хлапец браў у рукі ляльку — сьмерць, і гаворачы да яе, аж дрыжэў ад уражаньня . . . .

М. Станкевіч.

Ад Рэдакцыі: Беларускія групы ў ваколіцы Нью-Ёрку, зацікаўленыя паказаць батлейку на наступныя Каляды, просім зьвярнуцца да Беларуска-Амэрыканскага Т-ва, да сп-ні М. Станкевіч.

Mrs. M. Stankevich
6 Vandervoort Pl.
Brooklyn 37, N. Y.

Л І Р Н І К . . .

суўзвышэнца, так дарагога ўсім нам, а паэтамі й проста насьледаванага Уладзімера Дубоўкі. Да Дубоўкі зайшоўся яшчэ й Клемусь Якаўчык, адзін зь ягоных сябраў у Маскве, таксама блізкі да „Узвышша" (некаторыя ягоныя крытычныя артыкулы друкаваліся ў часапісе „Узвышша" пад псэўданімам К. Кундзіш). Неўзабаве нехта з двух іх падаў думку наведаць трэйцяга суродзіча ў Маскве — Міколу Равенскага, і мы ўсе падаліся на Малую Нікіцкую вуліцу, дзе ў будынку прадстаўніцтва БССР у сутарэньні меў тады кут гэты дзяржаўны стыпэндыят БССР.

У Менску мне толькі даводзілася назіраць Равенскага або з публікі, або з радоў ягонага хору, куды мяне ставілі, як хлапчука-дэкляматара для выступленьняў паміж нумарамі хору (гэтак-жа назіраў я й Тэраўскага), і толькі тут, у Маскве, я ўпяршыню спаткаўся зь ім прыватна, у кампаніі. За гады, што я ня бачыў яго, ён ані не зьмяніўся — быў такі самы сухенькі, рухава-жвавы, ветлы й сьціплы, як і той ягоны куток у сутарэньні прадстаўніцтва з вокнамі на роўні зямлі (зрэшты, ува ўсім гэтым, здаецца, і застаўся ён нязьменным праз усё сваё наступное жыцьцё). Зараз-жа замятусіўся — госьці, дарагія госьці, а частаваць і няма чым — адзін акраец хлеба, а ў Маскве ўжо сыботні вечар, і нідзе нічога ня знойдзеш . . .

Акраец хлеба на стале дзяржаўнага стыпэндыята, закватэраванага ў дзяржаўным прадстаўніцтве, навёў камусь з нас на дум і на вусны першыя радкі тады яшчэ так сьвежа-сэнсацыйных, незадоўга перад тым толькі апублікаваных „Лістоў да сабакі" нашага-ж узвышэнца Язэпа Пушчы:

Жыву цяпер я ў шумнай сталіцы
Далёка ад цябе, мой дружа.
Ляжыць акраец хлеба на стальніцы,
А на вакне ў збанку—юнацтва ружа.

Але-ж, усё тут было як у сук — і шум сталіцы, і акраец, зусім ужо рэ-

альны, а ня толькі паэтычна-ўмоўны, ды ня менш-жа сымбалічны, а заміж такое-ж „юнацтва ружы” — цэлы запраўдны букет юнацтва, у шчасьлівай эры якога былі тады йшчэ ўсе мы, нат старэйшыя, із самым гаспадаром улучна — такім роўна-юнацкім, як і роўна-сталым праз усё сваё жыцьцё. Ды ці-ж ня так сказаў быў пра сябе й той-жа Дубоўка:

У васнове я ўсё той-жа самы,
Калі хочаце — юнацтвам хворы . . .

Праўда, сказана гэта было яшчэ не тады, пару год па тым; тады й не магло нат сказацца — хворым хоць чым, хай і юнацтвам, ня чуўся ніхто з нас . . . Дык і той акраец, сымбалічны для долі ўсіх „дзяржаўных стыпэндыятаў”, як Пушча ці Равенскі, дый наагул усіх дзяржаўных і недзяржаўных гарунятаў Беларусі, ня мог уразіць нікога. Тым больш, што прадугледзівы Якаўчык падарозе зазірнуў у незачыненую яшчэ краму, і цэлы „бусел”, або „гусак”, белага сталовага віна спавітым дзіцяткам на руках Сяргея Дарожнага (не асабліва шчасьлівага гэтым, пакуль даводзілася ціскацца па маскоўскіх трамваях) прыбыў з намі й заняў сваё месца на стале, на пасаром і стушаваньне таму ганебнаму сымбалю.

Зь лёгкім вінам пайшла пералівацца й лёгкая гаворка з жартамі, анэкдотамі, а між іх і вершамі, нямінучымі ў гэткай кампаніі, — гаворка, што мела ў нашым асяродзьдзі сталы назоў „Інтэрмэдыі”. Гэта быў, фактычна, працяг таго, што пачалося яшчэ перад тым у Дубоўкі. Там, на нашую просьбу пачытаць што-небудзь із свайго новага, Дубоўка пазнаёміў нас з урыўкам паэмы, над якой пачынаў тады працаваць і якая за два гады была надрукаваная пад загалоўкам „І пурпуровых ветразяў узьвівы” (калі хто ня чытаў гэтага твору, які й дасюль заастаецца найбольшым і недаравальным грэхам паэты ў ваччу бальшавікоў, можа знайсьці яго ў часапісе „Узвышша”, № 2 за 1929 г., у тэй-жа публічнай бібліятэцы Нью-Ёрку). Тады яшчэ гэроі паэмы — Лірык і Матэматык — насілі больш празрыстыя алегарычныя імёны Пачуцьця й Развагі. Тут-жа, бяз усякай відавочнай тады сувязі, але ў нейкае, тады ўжо выразна вычутае падмацаваньне ўражаньня, Якаўчык прачытаў з томіка Эдгара По (EDGAR ALLAN POE), што аказаўся між іншых кніжок і папераў на заваленым імі стале Дубоўкі, ведамы верш „Воран” (The Raven).

Прачытаны Якаўчыкам у ангельскім арыгінале, верш гэты нек ашаламаніў нас. І я, дый мае менскія сябры, упяршыні ў жыцьці чулі жывую ангельскую мову, дарма, што ня з вуснаў жывога, запраўднага Ангельца ці Амэрыканца (Якаўчык, як і Дубоўка, вывучылі ангельскую мову ў Вышэйшым Літаратурна - Мастацкім Інстытуце Валерыя Брусава, які абодва скончылі, і вельмі захапляліся паэзіяй у гэтай мове). Мне тады, і ў думох не магло прымсьціцца, як жыцьцёваю наканавана было гэтай мове стацца для мяне калісь . . . Калі яна адразу й выдалася нейкай асабліва зразумелаю, дык гэта, пэўна-ж, таму, што добра знаёмым быў — з расейскага перакладу Брусава — самы той верш По (пасьля, як практычна давялося сутыкнуцца з ангельскай мовай, асабліва жывой, доўга ня была яна гэтак лёгкаю да разуменьня, як здалося тады). Ды найбольш уражалі новыя, ніколі ня чутыя, гучэньні, нейкія быццам-бы церпкія, калі-б можна было браць іх на смак. Аса-

(Працяг на бач. 16)

ХРОНІКА

КЛІЎЛЕНД

31-га сьнежня аддзел ЗБМА супольна з аддзелам БАЗА ладзіў сустрэчу Новага 1962 году. Моладзь прыгожа прыбрала салю й сталы, а таксама займалася й іншымі справамі зьвязанымі з рыхтаваньнем. Прыгожа грала аркестра „Палесьсе” пад кіраўніцтвам Ул. Літвінкі. Дзякуючы добрай арганізацыі й загадзя падзеленай працы, сустрэча мінула вельмі ўдала ды пабіла рэкорд і паводля колькасьці публікі і паводля прыбытку, што сьветчыць аб усьцяж большай папулярнасьці беларускае навагодняе сустрэчы ў Кліўленьдзе. Бясёда цягнулася да познае ночы. Нікому не хацелася разыходзіцца па хатах.

Кліўлендзкія танцаўнікі.

— На праваслаўныя Каляды аддзел ЗБМА арганізаваў калядоўшчыкаў. Пад кіраўніцтвам акардыяніста-га Ул. Літвінкі вельмі прыгожа гучэлі беларускія калядкі й уздымалі сьвяточны настрой у кажнай беларускай хаце. Сёлета хадзіла з калядкамі пераважна малодшая школьная моладзь. Аднак старэйшыя ня кідаюць, а паступова рыхтуюць малодшыя кадры, якія год па годзе набіраюць сілаў, усьведамляюцца нацыянальна ды вучацца беларускага народнага мастацтва.

— 14-га студзеня моладзь узяла актыўны ўдзел у ялінцы, ладжанай для дзяцей. Іра Каляда узрыхтавала зь дзецьмі цудоўную казку М. Міцкевіча „Цудоўная Ноч”. Усе дзеці выканалі свае ролі добра, а асабліва Галіна Кананчук у ролі Бабы Ягуты. Пасьля паказу Дзед Мароз (М. Страпко) раздаў дзецям падарункі.

— 25-га лютага ў найбольшай залі м. Кліўленду адбыўся 13-ты фэстываль, ладжаны арганізацыяй Народнага Мастацтва й газэтай „Кліўленд Прэс”. Да вышэй успомненае арганізацыі ад даўжэйшага часу належыць і кліўлендзкі аддзел БАЗА ды бярэ актыўны ўдзел у ладжаных імпрэзах. Сёлета ў фэстывалі брала ўдзел 19 нацыянальных групаў, якія паказвалі сваё народнае мастацтва й звычаі. Танцавальны гурток моладзі пад кіраўніцтвам Мані Лук'янчык вельмі прыгожа выканаў танцы: „Лявоніху” й „Мікіту”. Беларускія танцаўнікі, а іх было аж дзесяць параў, занялі адно зь першых месцаў у цэлай праграме. Глядачы колькі разоў заглушалі бурнымі воплескамі музыку. Аб вялікай удачы беларускага выступу сьветчыць даручаны дыплём ад ар-

ганізацыі Народнага Мастацтва й ліст, прысланы на адрыс старшыні БАЗА з газэты „Кліўленд Прэс". Гэта-ж заявіў і кіраўнік праграмы на мітынгу, які адбыўся тыдзень пазьней. За такія ўдачы вялікая падзяка належыцца кіраўнічцы танцавальнага гуртка, Мані Лук'янчык, ды кіраўніку моладзі, Кастусю Калошу, які старанна арганізаваў рэпэтыцыі ды ці мала зрабіў міляў, развозячы ды звозячы ўдзельнікаў.

ЧЫКАГО

Зь дзейнасьці Арганізацыі Беларуска-Амэрыканскае Моладзі ў Штаце Ілінойс (АБАМСІ):

— Што месяца перадаецца ў Чыкаго у ўкраінскай радыёгадзіне 15-часінная беларуская праграма, якая складаецца зь беларускіх песьняў, музыкі ды гутарак на актуальныя беларускія тэмы.

— У канцы леташняга году, 11-12 лістапада, АБАМСІ брала актыўны ўдзел у арганізацыі й правядзеньні нацыянальнае выстаўкі разам з Згуртаваньнем Беларусаў у штаце Ілінойс. Гэтая выстаўка, аб якой пісалася ўжо шырэй у беларускім друку, была запраўды вялікім дасягненьнем Беларусаў у Чыкаго, бо была добра арганізаваная, мела шмат вартасных экспанатаў, а што найважнейшае — наведалі не дзесяткі тысячаў чыкаскіх жыхароў.

— 18 лютага 1962 г. адбыўся гадавы сход АБАМСІ, на якім быў абраны новы ўрад у такім складзе: старшыня — Нікодым Жызьнеўскі, заступнік — Вацлаў Драбушэвіч, сакратар — Вера Рамук, скарбнік — Аўген Сідарэвіч. У рэвізійную камісію ўвайшлі: А. Захаркевіч, А. Кучура і Л. Сідарэвіч. Сход выказаў падзяку за дзейнасьць старому ўраду ды нацеміў плян працы на бягучы год.

НЬЮ-ЁРК

Гадавы баль ЗБМА ды адначасна сустрэча Новага Году (праваслаўнага — паводля старога стылю) ладзіліся сёлета ў Ленокс Гол у Мангэтане.

Дзякуючы стараньням кіраўніцтва аддзелу ЗБМА ў Нью-Ёрку, арганізацыя балю была вельмі добрая. Апрача танцаў галоўным пунктам праграмы былі выбары „Князёўны Балю", якою сталася сяброўка **Яра Тумаш.** Ейнымі дружкамі былі абраныя: **Ніна Каваль,** дзейная сяброўка ЗБМА, ды сп-чна **Паўлава.**

ЛІРНІК . . .

бліва гэтае, паўтаранае рэфрэнам слова "nevermore" — ну зусім-жа краканьне таго Ворана, што толькі яго й ведаў (тады я ня мог яшчэ ведаць, што ў жывой штодзённай мове яно зусім ня ўжываецца, а ў мове паэтычнай — ці не ў вадным толькі гэтым вершы ўсяго). Хтось з нас, здаецца, Лужанін, тут-жа зазначыў, што ў расейскім перакладзе — „никогда" — гучыць яно ўжо слабей, а ў перакладзе ў нашую мову гучэньне гэтае было-б зусім не да кантэксту — заміж краканьня ворана — нейкі перазвон званоў: „ніколі", ці, каб зусім дакладна — „ніколі больш" . . . На гэта Дубоўка заўвеціў, што звон гэты можна было-б падаць тут як хаўтурны, і так ён хоць нек заступаў-бы тое злавеснае краканьне. І ён прыгадаў Купалаў верш „Званы", прарэцытаваўшы яго із „Спадчыны", што таксама бадзялася на тым-жа сталe:

У мазгі залазіць жах, што гэты буйны
звон званоў,
Хаўтурны гэта звон спакон нямых
сталецьцяў,
Што гэтая званіца — мерцьвяковы
вечны схоў,
Званар — грабар, што косьці згортвае
па сьвеце —

Ці-ж у гэтай апошняй страфе Купалавага вершу — ня той-жа сэнс дый навет гук, што ў гэным По'ўскім "nevermore"? Тут Якаўчык, ізноў разгарнуўшы той-жа томік По, прарэцытаваў зь ягонага вершу „Званы" (The Bells) кавалак пра „зялезныя званы" ("iron bells").

Уражаньне ад „Ворана" ў вангельскім арыгінале прыйшло з намі з пакою Дубоўкі і ў гэтае, яшчэ больш у духу По, сутарэньне Равенскага ды неўзабаве ўсплыло і ў завязанай тут „інтэрмэдыі", цяпер ужо з крышку іншага боку. А што-ж трэба разумець пад самым гэным Воранам — пад тым няпрошаным і нявыпросным госьцем зь ягоным адзіным, настырлівым "nevermore" — „ніколі больш"? А хто такая тая Лінор, па якой уся туга паэты? У гэткім духу ставіў пытаньні, здаецца, Дарожны — прынамся для яго заўсёды характэрны быў гэткі, як казалі мы, „школьны падыход". Завязалася дыскусія на гэтую тэму, асабліва жвавая, калі выказаўся наш гаспадар, Раавенскі.

Сэнс ягонага выказваньня зводзіўся да таго, што паэзія, як і музыка, у васнове блізкая з матэматыкай. Але ў матэматыцы ёсьць арытмэтыка, дзе ўсё проста, двойчы два — чатыры, усе вялічыні канкрэтныя — „лікавыя", ды ёсьць і альгебра зь ейнымі „іксамі" й наагул вялічынямі, абазначанымі агульна й абстрактна, літарамі, пад якія можна падстаўляць канкрэтныя — „лікавыя" значаньні ў залежнасьці ад умоваў задачы. Так і паэзія можа быць „арытмэтычная" — простая й адназначная, ды „альгебраічная", як тут, дзе адны „вялічыні" мог падстаўляць пад Ворана й пад Лінор сам паэта, у залежнасьці ад сваіх „умоваў задачы", а зусім іншыя можам падставіць мы сягоньня, а яшчэ іншыя — заўтра, у залежнасьці ад нашых умоваў . . .

Мае менскія паэты не згаджаліся — матэматыка, як яшчэ й хэмія, ня цешылася іхнай сымпатыяй у тэхнікуме, — ці раз даводзілася памагаць ім выблытвацца зь ейных сілцоў. У іхным ваччу паэзія была нечым зусім супрацьлежным. Дубоўка й Якаўчык, не пярэчачы ў прынцыпе, зазначалі аднак, што гэткім „падстаўляньнем вялічынаў" так злоўжывае казённая савецкая, у Беларусі тады — „маладнякоўская" крытыка (можа тут якраз і прыйшло Дубоўку зрабіць з алегарычнай постаці Развагі свайго Матэматыка, што „пазнаў двойчы два і тым здаволен" і што ў ім так абурана пазнавалі сябе пасьля тыя казённыя крытыкі).

На гэтым дыскусія прыпынілася, ня прывёўшы тады да нічога, як бывала звычайна пры тагачасных нашых „інтэрмэдыях". Тым больш, што тым часам нек сам сабою спаветраў, як камфора, той небарачны акраец із стала, пэўна-ж, адно ўздражніўшы, а не ўтаймаваўшы апэтыту ў тых,хто й расшчыпаў яго па крыхтачках. Дык, па прапанову кагось із маскоўскіх, пастанавілі ўсёй кампаніяй нанесьці візыту яшчэ аднаму тутэйшаму Беларусу— Міхасю Дуброўскаму, у якога й адпаведная вячэра, казалі, была забясьпечаная.

Але пра гэта, дый яшчэ больш пра тыя часы й Равенскага — другім разам.

Цана: 50 ¢

СЯБРОУКІ Й СЯБРЫ!
АМЭРЫКАНСКІЯ ГРАМАДЗЯНЕ
БЕЛАРУСКАГА ПАХОДЖАНЬНЯ!

— Дамагайцеся ўводу беларускае мовы ў праграму „Голасу Амэрыкі"!
— Зьбірайце подпісы пад нашыя справядлівыя дамаганьні!
— Шлеце іх сваім кангрэсмэнам і сэнатарам!
— Шлеце нашыя дамаганьні ў мясцовыя газэты для публікацыі!
— Хай ніхто з нас не застанецца збоку!

* * *

НОВЫЯ ВЫДАНЬНІ

КНІГІ

Гітлін, Масей. Нацыянальнае сьведам'е сьв. Ап. Паўлы. Whiteruthenian Bible Committee.

Жывіца, Юры. Журавель. Расказы. Выд. „Вехаў", 1962. бал. 20.

— **Па чужых кутках.** Расказы. Выд. „Вехаў", 1962. бал. 20.

— **Праз сьлёзы.** Зборнік твораў. 2-ое выд. Выд. „Вехаў", 1962. бал. 20.

— **Умелы падыход.** Расказы. Выд. „Вехаў", 1962. бал. 20.

Радкевіч, А. Беларускі лемантар, перавыдаў Парафіяльны Камітэт Беларускай Прав. Царквы сьв. Еўфрасініі ў Саўт Рывэр, Н. Дж. 1961

Łosik, Anton. Biełaruski pravapis, Miensk 1943 г. (перавыданьне).

ЧАСАПІСЬМЕНСТВА

Siaubit – časapis katalicka-hramadzki, No. 24, studzień-luty 1962.

ПАДЗЯКА

Галоўнае Кіраўніцтва ЗБМА гэтым выказвае шчырую падзяку Беларусам Канады за сабраную імі летась (у 1961 г.) дапамогу беларускай моладзі ў Нямеччыне.

— Аддзел ЗБК у **Садбуры** пераслаў 40 кан. даляраў беларускай моладзі ў **Ляндгут.** Зьбіраў ахвяры сп. К. Каранеўскі.

— Аддзел ЗБК у **Монтрэалі** пераслаў 37.50 кан. дал. беларускай моладзі ў **Ляндсгут.** Зьбіраў ахвяры сп. А. Хрэноўскі.

— Аддзел ЗБК у **Торонто** пераслаў 20 дал. моладзі ў **Штутгарт** (праз ЗБМА) й 20 дал. моладзі ў **Ляндсгут.** Зьбіралі ахвяры сп. Маркевіч і сп. **Акула.**

Рэдкалегія: В. Кіпель, В. Станкевіч (гал. кіраўнік ЗБМА), Я. Запруднік, Ю. Станкевіч; **Карэспандэнты:** Ул. Дунец, Н. Жызьнеўскі; **Адміністратар:** Ю. Станкевіч; **Тэхнічны рэдактар:** В Мельяновіч.

Printed by Ukrainian American Press — 114 St. Marks Place, New York 9, N.Y.